
Незалежнае выданьне Жодзіна й Смалявіцкага раёну

ПРЭС Панарама

№5(16) **10.2007**

Інфармацыйны агляд рэгіянальных і агульнанацыянальных падзеяў

Навіны, факты, камэнтары, карысныя парады:
эканоміка, грамадзтва, права, зьмены заканадаўства,
калектыўная абарона грамадзкіх інтарэсаў, правоў і свабодаў ...









Ý¡ÐÀ Ï ÅÉÑÊ² ÌÀÐØ - Ó ÌÅ ÍÑÊÓ ...

Ó ÍÓ Ì ÀÐÛ:

Ï ðýñ Ï À Í ÀÐÀ Ì À

Ініцыятыва
“Мы - Ліцьвіны”
& Licviny-INFA

Цэнтар Ліцьвіны
ў Жодзіне



ПАРАД СІЛЫ, распачаты на ДЗЕНЬ ВОЛІ - спыніўся ЭЎРАПЕЙСКІМ МАРШАМ!
Але, сілавікі дзейнічалі мэтава - прывінтыўна затрымлівалі актывістаў у рэгіёнах, шкодзілі ў арганізацыі мерапрыемства ... Людзей палохалі звальненьнямі з працы, адлічэньнямі з вучобы, перашкаджалі ў камунікацыі і псыхалягічна ціснулі на семьі ...






— 12 кастрычніка 2007 г. прыкладна а 18.30 да мяне дамоў завітаў капітан міліцыі, начальнік аддзелу аховы правапарадку РАЎС г. Барысава Вячаслаў Паўлавец.
У ходзе размовы ён задаў мне пытаньне, ці зьбіраюся я ехаць на “Эўрапейскі марш”, які мае адбыцца 14 кастрычніка бягучага году, а калі зьбіраюся, тады а якой гадзіне дакладна й дзе знаходзіцца месца збору іншых плянаваных удзельнікаў маршу. Я адказаў, што згаданае мерапрыемства дазволенае ўладамі, таму я маю права на ім прысутнічаць. Капітан Паўлавец сказаў, што добра ведае пра санкцыянаваны характар акцыі, але настойліва параіў у Менск ня ехаць.
14 кастрычніка 2007 г. а сёмай раніцы мне да дому нехта патэлефанаваў. Адказала жонка. Мужчынскі голас запытаўся: ці дома знаходзіцца Анатоль Зянонавіч? Жонка казала, што зараз запрасіць мяне да тэлефону. Калі я ўзяў слухаўку, то ў ей ужо былі кароткія гудкі.
Навучаны сумным вопытам, я адразу здагадаўся, што супрацоўнікі міліцыі правяраюць, ці я дома, і што мая плянаваная паездка ў Менск можа не адбыцца. Я адразу апрануўся, выйшаў ва двор. За брамкаю, мэтрах у двацццаці, стаяў легкавік з прыватнымі нумарамі, іншамарка. На жаль, нумар машыны я не запомніў. Марку таксама не магу ўзгадаць. Калі я падыйшоў да машыны, кіроўца адкрыў бакавое шкло. У салоне сядзелі два маладыя чалавекі ў цывільным. Я запытаўся ў іх: што, ахова? Смяючыся, яны адказалі: так,




Міліцыя сачыла за апазыцыяй у рэгіёнах у дзень Эўрапейскага Маршу

Дэмакратычны актывіст Анатоль Аскерка зьвярнуўся ў пракуратуру Барысава са скаргаю. Увесь дзень 14 кастрычніка за ім сачылі супрацоўнікі міліцыі й КДБ, каб не дазволіць яму ўдзельнічаць у Эўрапейскім Маршы ў Менску.
Прапануем вашай увазе тэкст скаргі Анатоля Аскеркі, ў якой палітык падрабязна распавядае пра незаконныя дзеяньні міліцыянтаў.



Эўрапейскі марш прайшоў без СПЭЦНАЗУ

«Вайну» перанесьлі зь Менску ў рэгіёны - далей ад Эўрапейскіх амбасадаў ...





ахова. Тады я патлумачыў, што зьбіраюся ісьці на рынак, ці дазваляюць яны гэта мне зрабіць? Яны адказалі, што няма пытаньняў. Прыкладна а палове на дзевятую раніцы я накіраваўся на аўтобусны прыпынак. Праз некалькі дзесяткаў мэтраў мяне дагнала вышэйзгаданая іншамарка. Запыталі: куды? на рынак? Я адказаў. што так, на рынак. Мне прапанавалі сесьці ў машыну. На маю просьбу прадставіцца адказалі адмоўна. Баючыся правакацыяў, калі мяне могуць потым абвінаваціць у непадпарадкаваньні супрацоўнікам міліцыі, я сеў у легкавік. На рынку пад пільным наглядам маіх “целаахоўнікаў” я разам з сваім шваграм зрабіў неабходныя пакупкі. Потым мы зноў селі ў аўто і рушылі ў накірунку дома. Пасля таго, як швагар выйшаў каля свайго дому на вуліцы Батурына, кіроўца ветліва папрасіў прабачэньня і сказаў, што яны маюць загад ад кіраўніцтва даставіць мяне ў РАЎС. У кабінэце, куды яны мяне завялі, чалавек у цывільным прадставіўся як “падпалкоўнік Волкаў”. Гэта было прыкладна а дзесятай раніцы. На маю прозьбу даць тлумачэньні з нагоды майго знаходжаньня ў РАЎС, падпалкоўнік Волкаў адказаў, што яму вядома аб намеры ехаць у Менск на “Эўрапейскі марш”. Тады я зноў згадаў аб тым, што мерапрыемства зьяўляецца санкцыянаваным. Сьмяючыся, Волкаў сказаў, што ў маіх інтарэсах застацца на момант правядзеньня акцыі ў Барысаве, каб пазьбегнуць





магчымых непрыемнасьцяў, напрыклад, выкарыстаньня фізычнае сілы супраць мітынгоўцаў. Дадаў, што бліжэйшы час мы будзем бяседаваць, будзем “вас выхоўваць”. Бяседа цягнулася да 13 гадзіны. Потым ён выклікаў тую самую машыну з тымі самымі маладымі людзьмі, на разьвітаньне сказаўшы, што настойліва не рэкамэндуе ехаць у Менск. На гэта я адказаў, што ўжо не паеду, таму як згублены час. На тым жа аўтамабілі мяне адвезьлі да хаты. Перакусіўшы, я па прозьбе жонкі, накіраваўся ў краму за прадуктамі. За брамкаю мяне чакала ўжо знаёмая машына. Гэта была прыкладна а палове на другую гадзіну дня. Пад суправаджэньнем машыны я схадзіў у краму. Па дарозе да дому мае “целаахоўнікі” папярэдзілі мяне, што будуць тэлефанаваць да дому кожную гадзіну, каб правяраць маю прысутнасьць дома. Так кожную гадзіну яны тэлефанавалі мне да дому, прадстаўляліся: “Вашы ахоўнікі” і пыталіся, ці я дома? Апошні раз мне патэлефанавалі а 17 гадзіне. Ужо пасьля гэтага яны зьехалі.

На падставе вышэйзгаданага, а таксама кіруючыся арт. 4-6, 14, 27 Закону аб пракуратуры Рэспублікі Беларусь, Анатоль Аскерка просіць прыняць меры пракурорскага рэагаваньня ў адносінах да пералічаных асобаў, якія парушылі ягонае канстытуцыйнае права на свабоду меркаваньняў, пераканаўньняў, іх свабоднае выяўленьне, а таксама на свабоду сходаў, мітынгаў і вулічных шэсьцяў, зафіксаваных ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Па матэрыялах Радыё “Свабода”

КАМЭНТАР АЛЯКСЕЯ ЛАПІЦКАГА



Аляксей Лапіцкі - праваабаронца з Жодзіна, выпускнік праграмы па міжнародным праве правоў чалавека й выкарыстаньні міжнародных стандартаў у нацыянальнай і міжнароднай абароне грамадзянскіх і палітычных правоў асобы ...

Аляксей Лапіцкі:

- Падобныя дзеяньні сілавікоў у дачыненьні да ідэалягічных апанэнтаў рэжыму, фіксуемыя пэрыядычна па ўсёй Беларусі, адрозьніваюцца толькі дэталямі. У сваёй аснове яны - цалкам непраўмерныя і, безумоўна, патрабуюць дакладнай фіксацыі, звароту у нацыянальныя праваахоўна-судовыя інстанцыі і да міжнародных “арбітраў” (у Камітэт ААН па Правах Чалавека). Такім чынам, масавы і сыстэмны характар парушэньня правоў асобы можа быць дакумэнтавана пацьверджаным і стацца прадметам для разгляду на ўзроўні Савету ААН па Правах Чалавека. А гэта значна больш уплывовы інструмэнт абароны парушаемых правоў, чым Камітэт ААН. Такім чынам, міжнародная супольнасьць даволі дзейснымі спосабамі дапамагае краінам-

Працяг на ст. 4-5

Ï ÅÐÀ Í Î ÅÑÜ Ë2

“ÂÀÉ Í Ó”



ÇÜ ÌÅÍÑÊÓ

Licviny-INFA

Працяг, пачатак на ст. 2



Міліцыя сачыла ...

КАМЭНТАР АЛЯКСЕЯ ЛАПІЦКАГА ...

парушальніцам міжнародных пагадненьняў у галіне правоў чалавека паважаць узятыя на сябе абавязкі і безумоўна гарантаваць сваім грамадзянам поўную рэалізацыю міжнародных стандартаў права на адпаведнай нацыянальнай тэрыторыі.

Пакуль чыноўнікі абсалютна безпакарана кіруюцца не прававымі нормамі і законам, а загадамі і голай ідэалягічнай мэтазгоднасьцю - будзе існаваць спрыяльная глеба для пашырэньня практыкі злоўжываньняў уладаю, палітычнага перасьледу і рэпрэсыяў ...

Галоснасьць і публічнасьць, веданьне ўласных правоў і настойлівасьць у дасягненьні справядлівага прысуду з выхадам, калі гэта патрэбна, на міжнародныя мэханізмы абароны - ёсьць адзіным спосабам супрацьстаяць праўнаму бязьмежжу і гвалту ў краіне.

Сьвятлана Лапіцкая:



- У выпадку Анатоля Аскеркі з Барысава, якога без аніякага тлумачэньня “невядомыя” асобы не пускалі на санкцыяваны ўладамі Эўрапейскі марш, праглядаецца поўнае свавольства ў дзеяньнях міліцыі, нейкая бандыцкая брутальнасьць зносінаў з чалавекам, у дачыненьні да якога апошнія нясуць зусім іншыя абавязкі - ахоўваць ягоныя правы. Самым паказальным для Барысаўскай справы ёсьць тое, што сілавікі, нават, не паспрабавалі хоць неяк фармальна ўзаконіць свае дзеяньні ...

Гэта можа быць сьведчаньнем таго, што яны цалкам упэўненыя ў бязьдзейнасьці праваахоўна-судовых інстытуцыяў альбо спадзяюцца на пасыўнасьць ці неінфармаванасьць самаго пацярпелага. Лёгіка праста - калі на нацыянальным роўні пацярпеламу ад рук службоўцаў няма на што разьлічваць, дык ён і не будзе нічога рабіць. А мінулагодняя падобная Жодзінская справа (калі з “маршруткі” за рукі і за ногі выносілі актывістаў, якія ехалі на “Чарнобыльскі Шлях”) паказала, што “нашая шаноўная” пракуратура не можа пацьвердзіць падобныя неправамерныя дзеяньні (нават зафіксаваныя на фота) супраць апазыцыянэраў, бо не можа ўзбудзіць справы супраць (напрыклад намесьніка начальніка Жодзінскай міліцыі тав. Дарошкі ...). На гэтым функцыі пракуратуры ў беларускіх умовах, нажаль, спыняюцца ...

Таму парушальнікі ўпэўненыя - усё будзе ціха і спакойна. У такіх варунках атрымаўшыя звышпаўнамоцтвы міліцыянты пачынаюць адчуваць сябе “законам” - ім здаецца, што яны самі вольныя калі ім заўгодна пазбавіць любога з грамадзянаў ягоных правоў і свабодаў!? Аднак, гэта далёка не так проста. Яны ведаюць, што зьдзяйсьняюць злачынствы. Яны ведаюць і баяцца быць апазнанымі ... - любая сыстэма, асабліва тая, якая працуе неправамерна пакідае за сабою сьляды ўласных злачынстваў, і яна - не даўгавечная.

ПРАВА КОЖНАГА - ЖЫЦЬ У СВАБОДЗЕ



Дванаццаць патрабаваньняў Эўропы да ўладаў Беларусі - гэта шлях да законнасьці і дэмакратыі, міру і згоды, магчымасьць атрымаць сапраўдную дапамогу для стабільнага разьвіцьця краіны.





ЭЎРАПЕЙСКІ ШЛЯХ ПРАЙШОЎ ПАД СОНЕЧНЫМ НЕБАМ. КАСАК І ДУБІНАК СПЭЦНАЗУ - НЕ БЫЛО ЗАЎВАЖАНА ...

Photo: Licviny-INFA





Апынуўшысь у падобных умовах чалавек, да якога ўжываецца гвалт з боку "праваахоўнікаў" становіцца перад фактам, што ў гэтай краіне яго няма каму абараніць. Дзяржструктуры, якія мусяць гэта рабіць - дзейнічаюць па нейкім "вар'яцкім пляне" - яны маюць зусім іншыя задачы ў адносінах менавіта да гэтага канкрэтнага чалавека. Бо ён - не такі як яны. Ён мае іншыя погляды. Ён па іншаму думае і размаўляе, не на той мове і г. д. ... - гэта палітычны апанэнт рэжыму. І адно гэта адразу пазбаўляе яго ўсіх правоў і свабодаў. І гэта ўжо - страшна. Бо гэта - таталітарны выклік грамадзтву, выклік брутальнага й цынічнага клану, які расплачваецца за ўласныя "экспэрыменты" з агульнанароднай казны. І за народныя грошы пазбаўляе гэты ж народ дэмакратычнага выбару, дэмакратычных каштоўнасьцяў і абсалютна безкаштоўнай свабоды.

Аляксей Лапіцкі:
- Аднак, у нас ёсьць надзейная міжнародная прававая апора. Кожны мусіць ведаць, што Міжнародны Пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах (ад 1966г.), падпісаны Беларусьсю, і адпаведныя палажэньні Канстытуцыі РБ утрымліваюць поўны пералік правоў і свабодаў наўпростага дзеяньня, дзеля безумоўнага забесьпячэньня якіх Дзяржавы-Удзельніцы (у тым ліку і Беларусь) пагадзіліся ўзгадняць і рэглямэнтаваць свае намаганьні як гаранты поўнага і безумоўнага іх выкананьня, у дакладнай адпаведнасьці зь дзейснымі агульнапрызнанымі прынцыпамі і нормамі міжнароднага права.
Пры гэтым, у галіне правоў і свабодаў кожны грамадзянін (на ўзроўні зь дзяржаваю) сёньня прызнаны паўнавартасным суб'ектам міжнароднага права. Таму, калі грамадзянін бачыць бязьдзейснасьць нацыянальнай праваахоўна-судовай сыстэмы па фактах парушэньня ягоных правоў і свабодаў ён можа самастойна наўпрост зьвяртацца да міжнародных мэханізмаў праўнай абароны і да абсалютна незангажаваных экспэртаў права, якія пастаўяць усе кропкі над "і".

Для грамадзянаў Украіны ці Расеі, напрыклад, сёньня самым дзейсным міжнародным мэханізмам абароны правоў і свабодаў ёсьць зварот у Эўрапейскі суд. Для Беларусі, удзельніцы Міжнароднага Пакту і заснавальніцы ААН, на сёньня, пакуль, працуе толькі мэханізм індывідуальнага звароту ў Камітэт ААН па Правах Чалавека.

Такім чынам, толькі зьвяртаючыся да правасудзьдзя (да нацыянальнага і потым да міжнароднага) кожны грамадзянін можа і павінен прыцягнуць увагу адпаведных інстытуцыяў да фактаў наяўнасьці і безпакаранасьці парушэньня правоў і свабодаў (калі такія маюць месца), спрыяць хутчэйшаму спыненьню падобнай практыкі злоўжываньня ўладаю ў сваёй краіне.

Дабіцца ўзнаўленьня ўласных правоў і пакараньня канкрэтных правапарушальнікаў у беларускіх умовах, часам, уяўляецца не магчымым. Але, гэта ёсьць вельмі вялікай памылкаю (слабым месцам) тых, хто бязконца разьлічвае на ўласную безпакаранасьць.

Бо мэханізмы праўнай міжнароднай абароны, нават без нацыянальнай падтрымкі, сёньня існуюць. Яны абапіраюцца на трывалы падмурак міжнароднага права ў галіне правоў чалавека і ў цяперашніх складаных праўных умовах у Беларусі, яны здольныя накапліваць свой безадказна дзейсны (на больш працяглым этапе часу) патэнцыял. Яны дзейнічаюць не адразу.

Навогул, час працуе на дэмакратычныя зьмены і рухае краіны сусьвету да прадказальнай, праўнай і справядлівай супольнасьці. Злодзеі - становяцца вядомымі, справы аб злачынствах - толькі чакаюць свайго часу для належнага вырашэньня ...

У гэтай сытуацыі, варта было б нагадаць, што сьляпыя выканаўцы злачынных загадаў, ці тыя, хто сьвядома зьдзяйсьняе правапарушэньні (карыстаючыся ўладнымі паўнамоцтвамі) павінныя ведаць, што ім калісьці абавязкова прыйдзецца несьці адказнасьць. Таму тыя, каго прымушаюць узьдзейнічаць на грамадзянаў неправавымі мэтадамі, павінны зразумець тое, што можна, а чаго пры любых умовах нельга рабіць ...
У іншым выпадку - іх будзе выкарыстоўваць у якасьці зброі карпаратыўная вэртыкаль улады.

Хай чыноўнікі высокага ўзроўню самі паспрабуюць патлумачыць тады бязьдзейснасьць дзяржаўнай праваахоўна-судовай сыстэмы па падобных фактах палітычнага перасьледу, а таксама ўсю тую неправамерную практыку, якая будзе станавіцца прадметам галоснай і ўплывовай праўнай ацэнкі.

Хай нехта зь іх, патлумачыць з пазыцыяў абавязковасьці выкананьня міжнародных стандартаў права і дамоўных абавязкаў краіны, чаму падобныя факты маюць месца!

Працяг на ст. 6

Ì Î É Ã Î ÐÀÄ ...

ÇÀ Ý ¡ ÐÀ Ï ÅÉÑÊ² Ã Î ÐÀÄ !



Ì Î É Ã Î ÐÀÄ -
ØÈÐÕ, ÆÛÂÀß
ÏËÛ ÍÜ
ÏÐÛÐÎÄÛ,
ÄÇ²Â Î Ñ Í Û
Ñ Î Í Ó
Â Î ÑÅ Í ÜÑÊÀÉ
Ö²Ø Û,
² Ç Î ËÀÒÀ Ì
ÐÀÇÜË²ÒÛ Ì ËÇ
ÄÀÐ Î Ã² -
ÑÀ Ì Î ÒÀ
¡Ñ Ï À Ì ² Í À¡
ÓÄÓØ Û ...

АЛ





Працяг, пачатак на ст. 2-5

Хай ён патлумачыць, якім чынам падобныя дзеяньні дзяржаўных суб’ектаў права стасуюцца з імкненьнем да рэалізацыі прынцыпаў дэмакратычнай і прававой дзяржавы!?

Хай паспрабуе тады даказаць, што праваахоўна-судовая і адміністратыўная сыстэмы Беларусі - працуюць на поўнае і безумоўнае выкананьне патрабаваньняў Міжнароднага Пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах, Венскай канвэнцыі аб праве міжнародных дамоваў, а таксама адпаведных нормаў Канстытуцыі і нацыянальнага заканадаўства!

Такім чынам, кожнае парушэньне правоў чалавека, кожны пацярпелы ад свавольства чыноўнікаў, адміністрацыі, любога іншага суб’екту права ў краіне будзе абарачвацца для рэпрэсыўнага мэханізму бумэрангам, той перашкодаю, на якой рэжым ўрэшце абавязкова “зломіць сабе зубы”...

*** *** ***

І сапраўды, моц і прыярытэт права даўно асэнсаваныя ў сьвеце. Толькі глупцы ... дазваляюць сабе пляваць супраць ветру ды й спыняць рух “цягніка гісторыі”.

Будучыня - за свабодным і годным чалавекам. Дзеля гэтай свабоды і гэтага сьвятога права “Чалавекам звацца” варта жыць, змагацца і ... - перамагаць.

Кожны чалавек - паўнавартасны суб’ект міжнароднага права ў справе абароны ўласных правоў і на кожным кроку да праўды ён можа цалкам разьлічваць на падтрымку сусьветнай праўнай супольнасьці як на нацыянальным, гэтак і на міжнародным узроўні.

Па матэрыялах Радыё Свабода, Алесь Вольны, Licviny-INFA

Ó Ì À¨É ÑÒÀË²ÖÛ ...

Вуліцаў імя Вайніловіча, Брыля і Сапегі ў Менску ня будзе?

Іна Студзінская, Менск Рашэньне дэпутатаў Менгарсавету перайменаваць вуліцу Берсана ў вуліцу Вайніловіча, а таксама надаць новым сталічным вуліцам імёны Лява Сапегі й Янкі Брыля не прайшло прававой экспэртызы ў Міністэрстве юстыцыі. Пра гэта паведаміла “Наша Ніва” са спасылкай на крыніцу ў Менгарвыканкаме.

26 верасьня на пятай сэсіі Менскага гарадзкога савету дэпутаты пастанавілі даць назвы шэрагу новых і перайменаваць некаторыя вуліцы сталіцы. З просьбай назваць вуліцы імёнамі **Сапегі, Брыля і Вайніловіча** зьвярнулася Таварыства беларускай мовы і Рымска-каталіцкі касьцёл. У новым мікраранёе Міхалова плянавалі новым вуліцам надаць імёны клясыка беларускай: літаратуры Янкі Брыля й вядомага дзяржаўнага і палітычнага дзеяча Беларусі, канцлера Вялікага Княства Літоўскага Лява Сапегі. Таксама было рашэньне аб перайменаваньні вуліцы Берсана ў вуліцу імя заснавальніка касьцёла сьвятых Сымона і Алены Эдварда Вайніловіча. Тады “за” прагаласавалі 37 дэпутатаў з 44.


Дэпутат Менскага гарадзкога савету, намесьнік старшыні камісіі па культуры **Ўладзімер Краўчанка** паведаміў, што афіцыйнага адказу зь Міністэрства юстыцыі дэпутаты пакуль не атрымалі. Але навіной быў зьдзіўлены: “Павінна ж быць нейкая прычына! Дапусьцім, называньне вуліцы імём Напалеона Орды прайшло экспэртызу, чаму тады Сапегі не прайшло? Берсана — так, тут

ÐÎÄÍÓÞ ÌÎÂÓ – ÓËÀÄÛ ÃÎÐÀÄÀ ÏÀÊÀÇÀËÜ ÍÀ ²ÃÍÀÐÓÞÖÜ...!?



ÀÄÊÐÛÒÀÅ ÏÛÒÀÍÜÍÅ ÄÀ ÌÝÐÀ ÃÎÐÀÄÀ ...

À ìîæà ¢ ðàñåéñêàìî¢íûõ ÷ûíî¢í³êà¢ Æîäç³íà õðàí³÷íàÿ áë³çàðóêàñüöü ...?!



Мэр горада, Васіль Грышчанка.



ÁÅËÀÐÓÑÊ²ß ÍÀÇÂÛ ÂÓË²ÖÀ¡ Ó ÆÎÄÇ²ÍÅ ÇÜÍ²ÊÀÞÖÜ?!

мог нейкі фактар ролю адыграць. А што тычыцца Сапегі й Янкі Брыля — мне зусім не зразумела”. Нічога канкрэтнага не адказалі й ва ўпраўленьні культуры Менгарвыканкаму.

Натальля Старыкава, загадчыца сэктару культасьветработы, якая займаецца пытаньнямі перайменаваньня вуліц, на пытаньне “Свабоды” адказала так: “Я ня ведаю, інфармацыя, пра якую вы кажаце, мне не расьпісаная”. Карэспандэнтка: “Але такая інфармацыя павінна зь Мін’юсту да вас паступіць?” “У прынцыпе, так. Калі палічаць патрэбным, то паступіць”.

Начальнік Упраўленьня прававой экспэртызы прававых актаў Нацбанку і рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіраваньня Міністэрства юстыцыі **Вера Ярохава** спаслалася на занятасьць і паскардзілася, што ня мае фэнамэнальнай памяці, каб згадаць усе дакумэнты: “Цяпер я нічога вам сказаць не магу, таму што трэба глядзець гэты дакумэнт, а дакумэнтаў ідзе вельмі шмат на нашае ўпраўленьне. Такіх, якія не праходзяць экспэртызу, таксама нямала”.

Карэспандэнтка: “А ці ўсе перайменаваньні вуліцаў павінны праходзіць экспэртызу Мін’юсту?” “Па-рознаму перайменаваньні адбываюцца. Ёсьць указы прэзыдэнта — яны, натуральна, у нас не праходзяць экспэртызу. У нас экспэртыза толькі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў і міністэрстваў ведамаснага ўзроўню”.

Такім чынам, атрымліваецца, што калі перайменавалі праспэкт Скарыны ў праспэкт Незалежнасьці, праспэкт Машэрава ў праспэкт Пераможцаў — экспэртыза Міністэрства юстыцыі не была патрэбная, бо быў указ прэзыдэнта. А калектыўнае рашэньне дэпутатаў Менгарсавету павінна праходзіць прававую экспэртызу.

www. svaboda.org



Photo: Licviny-INFA

Á²Ë²ÍÃÂ²ÇÌ íåéê³ àäíàáîê³ àòðûìë³âàåööà - ÿê íå ïàãëÿäç³ø óí¸ ïà-ðàñåéñêó!
², íàâàò, - ìýòðîâûì³ ë³òàðàì³!
Ìàáûöü, êàá í³õòî áîëüø íå ñóìíÿâà¢ñÿ ¢ ... “íàøàé ç Âàì³ ïåðàìîçå”!?
Êàãî ïåðàìàãàåì, “òàâàðûøû-ïàíîâå”!?

А БЕЛАРУСЬ – ЖЫВЕ!

У межах Ініцыятывы “За Эўрапейскі ГОРАД” (Жодзіна) пры падтрымцы барда Кастуся Герашчанкі, ТБМ і БНФ “Адраджэньне” у Жодзіне правялі аўтарскі канцэрт: “А Беларусь – ЖЫВЕ!”.

Дадзенае мерапрыемства, ня гледзячы на даволі позьні час, сабрала з паўсотні слухачоў, сярод якіх былі як людзі сярэдняга, гэтак і маладога веку, падлеткі й дзеці.

Канцэрт распачаўся прамоваю Аляксея Лапіцкага, які ў некалькіх словах прадставіў прысутным свайго сябра, таленавітага барда Кастуся Герашчанку, і зьвярнуў увагу аўдыторыі на безкаштоўную сілу мастацтва, якое ўмацоўвае гэтак патрэбныя кожнаму чалавеку – веру, надзею і любоў, цудатворныя маякі і апоры ў жыцьці кожнага чалавека, здольныя рабіць сапраўды немагчымае ...

Было адзначана, што для таго, каб Беларусам адстаяць уласную чалавечую вартасьць і зьберагчы нацыянальныя сьвятыні трэба любіць сваю краіну, верыць у ейную будучыню, у адраджэньне нацыянальнай спадчыны, мовы … традыцыяў эўрапейскасьці.

– Што б не адбывалася, у выніку – перамагае заўсёды любоў і свабода.

Беларусь была, ёсьць і будзе неад’емнай часткаю Эўропы, дзе каштоўнасьці дэмакратыі ёсьць асноваю для



ўстойлівага разьвіцьця грамадства, росту эканомікі і разьвіцьця дабрабыту.

Эўрапейскі горад – гэта як зьнешняя ўпарадкаванасьць і чысьціня вуліцаў, кветкі, роўныя тратуары …, гэтак і высокая культура ўзаемаадносінаў, павага да нацыянальных здабыткаў і дэмакратычных каштоўнасьцяў, нацыянальнай гісторыі, мовы ... Гэта – утульны дом для ўсіх – месца, дзе нараджаюцца і гадуюцца дзеці. Гэта – тая атмасфэра дабразычлівай павагі да права кожнага чалавека, у якой можа нармальна і бясьпечна, безканфліктна разьвівацца свабодная і гуманістычна арыентаваная грамадзкая супольнасьць Беларусі.

З кожным новым сьпевам, які камэнтаваў сам Кастусь Герашчанка, аўдыторыя адгукалася ўсё новымі і новымі цёплымі апладысмэнтамі. Падчас выступу прагучалі шматлікія выдатныя творы на вершы В. Супруна, А. Сокалава, Ав. Дзеружынскага, В. Шніпа, Г. Бураўкіна, А. Марачкіна, С. Чыгрына, К. Герашчанкі, Зьм. Марозава ... з альбому пад назовам “Час выбіраць”, які быў запісаны аўтарам у 2007 годзе.

Прэзентацыяй фільму “Беларускі фронт” ці “Размовы пра мову” рэжысэра Віктара Корзуна, была завершана сустрэча.

Гэта была – сустрэча сяброў, пасьля якой засталіся добрыя эмоцыі і ўспаміны.

Напрыканцы прысутныя прыдбалі на памяць дыскі зь песьнямі любімага артыста і гурта “Пліса”.

Такім чынам, выдатны восеньскі дзень быў завершаны цёплай сяброўскай вечарынаю, памяць аб якой, думаецца, застанецца ў кожнага ўдзельніка добрым успамінам.

Як ніколі было ясным і зразумелым: Беларусь – Жыве! Яна дыхае сьвежым паветрам пераменаў, што бяруць пачатак у кожным закаханым у свабоду сэрцы, у думках і надзеях, у нашае веры, якую не здольныя вынішчыць ні пакуты, ні мана, ні здрада …

З кожным сьвежым подыхам прасторы вецер пераменаў напаўняе ветразі нашых мараў і спадзяваньняў, скіроўвае нас у новую будучыню, свабодных і годных людзей, дзяцей сваёй матчыны Радзімы, незалежнай, вольнай і непадкупнай – нашай адзінай у сьвеце Спадчыны – БЕЛАРУСІ.

Алесь Вольны, Licviny-INFA

У выданьні выкарыстоўваецца правапіс першакрыніцаў (калі ён блізкі да сучаснага клясычнага варыянту). Пераклады робяцца з улікам сучаснай канцэпцыі натуральнага ўнармаваньня абодвух правапісаў (да- і пасьлярэфармаванага). Рэдакцыя працуе без карэктара, таму прыносіць свае прабачэньні за магчымыя адрукоўкі ў тэкстах ...

Бліжэйшы канцэрт барда з в.а.“Пліса” - 24.11.2007г., Зялёны Бор

Незалежнае выданьне грамадзкай супольнасьці Жодзіна
(Выдавецкая ініцыятыва “Мы - Ліцьвіны” і агенцыя Licviny-INFA)
Адрас рэдакцыі: 222160 Жодзіна, а/с 201
E-mail: c_licviny@tut.by
Наклад 299 асобнікаў.
Рэдактар АЛЕСЬ ВОЛЬНЫ
Пры перадруку спасылка на выданьне і першакрыніцу абавязковая.